View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Герасімёнак М.А., Заяц Н.В. (Мінск)**

**Гістарычная тэма ў творчасці Максіма Танка і Алеся Пісьмянкова**

У кожнага чалавека і краіны ёсць свая непаўторная гісторыя. Нярэдка цікавыя аповеды аб роднай зямлі становяцца крыніцай паэтычнага натхнення. У творчасці Максіма Танка гістарычная тэма не была дамінантнай, аднак, несумненна, творы пра мінулае прадстаўлены ў яго паэтычнай спадчыне. Так, напрыклад, народны паэт звяртаўся да адной з самых драматычных старонак нацыянальнай гісторыі – у шэрагу позніх вершаў актуалізуюцца тэма памяці пра Вялікую Айчынную вайну і праблема паўтарэння падобных трагедый (вершы “На археалагічнай разведцы”, “Ніхто не забыты...” і інш.). Тэма далёкіх часоў прадстаўлена ў вершах “Гравюры Скарыны”, “Багрым”, “Язэп Драздовіч”. Цікава, што паэт звяртае ўвагу не на падзейны бок гісторыі, а на “асобасны” – у цэнтры твораў выключныя прадстаўнікі беларускага народа. Драматычныя старонкі ХХ стагоддзя таксама неаднаразова станавіліся прадметам мастакоўскага роздуму і атрымлівалі ўвасабленне (вершы “Курапаты”, “Рэабілітацыя”). Некаторыя творы на тэму нядаўняга мінулага, напрыклад, “Цяпер асцерагайцеся”, “Тут Беларусь была”, з’яўляюцца адначасова і паэтычным папярэджаннем: згадваючы пра трагедыі мінулага, аўтар імкнецца прадухіліць іх паўтарэнне ў будучым.

У прадстаўніка маладзейшай літаратурнай генерацыі Алеся Пісьмянкова таксама, як і ў Максіма Танка, у параўнанні з іншымі паэтамі не так многа вершаў на гістарычную тэму, аднак нягледзячы на іх невялікую колькасць, па трапным выказванні А. Марціновіча, гэты аўтар “адзін з нямногіх, хто з першых жа сваіх творчых крокаў <…> адразу намацаў тую сцяжыну, што вядзе ў мінуўшчыну роднага краю, кранаецца самых вытокаў, а ўжо з гэтых агледзін даўніны паспяхова перайшоў і да больш глыбокага асэнсавання паняцця Радзімы, Бацькаўшчыны, Беларусі” [1, с. 183].

А. Пісьмянкоў стварае сапраўдны летапіс свайго роду, бацькаўшчыны і краіны. Так, у вершы “Продкі” А. Пісьмянкоў ўзнаўляе свой радавод, які прадвызначае і ягоныя ўчынкі, і будучыя дзеянні яго нашчадкаў: “Імёны памяць берагла. / Вяла праз церні, / Каб я не сеяў зла, / А толькі – зерне. / Да іх іду я зноў і зноў, / Ім веру свята. / Таму й вяду сваіх сыноў / Да іх на раду” [2, с. 129] (“Продкі”). У многіх вершах (“Род”, “Балада роду”) аўтар працягвае развіваць ідэю пра тое, што гісторыя не знікае ў нябыт, а становіцца часткай жыцця іншых пакаленняў, у многім дэтэрмінуе сучаснасць: “Курганы моўчкі спяць на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўлонні, / Даўно ў музеі лук і меч…/ А мне ўсё сняцца тыя коні, / Што неслі продкаў цераз смерць” [2, с. 10] (“Балада роду”).

Верш “Балада роду” з’яўляецца паэтычнай гісторыяй сям’і: “З Дняпра наш продак родам, / З зямлі Машэк, з зямлі Вашчыл. / Гарачы норавам і сэрцам, / Як люд у нашай старане, / Вачэй радзіміцкіх азерцы, / Крыху гарэзінкі на дне” [2, с. 10]. Паводле сямейнай легенды, род Пісьмянковых пайшоў ад працавітага, мужнага селяніна, які добра ведаў грамату і валодаў пяром: “З пяром і граматай у згодзе / Ён жыў. І незнарок, / Казалі, князь пры ўсім народзе / Яму імя даў – Пісьмянок” [2, с. 10]. Аўтар апраўдвае сваё радавое прызначнне – пісаць – і годна працягвае закладзеную даўнім дняпроўскім продкам традыцыю.

У многіх вершах ствараецца вобраз летапісца – чалавека, які занатоўвае ўсе падзеі, што адбываюцца на яго зямлі, і балюча іх перажывае: “Трывогаю лоб узараны. / Глыбока запалыя вочы. / Нібыта жывыя дзве раны / Ці вогнішча два сярод ночы. / Вочы такія / Не зробяць ліхога, / Вочы такія / Ніколі не схлусяць, / Вочы такія / Страчаў я ў святога / У хатах маёй Беларусі. / Боль стагоддзяў у іх увабраны / І пакуты зямлі векавыя… / Не вочы, / А – раны, / Незагойныя раны жывыя” [2, с. 132] (“Вочы летапісца”). У вершы “Якаў Палачанін” А. Пісьмянкоў сам нібы ператвараецца ў летапісца і ўслаўляе старажытнага воіна, якога яго даўні “калега” абышоў увагай: “Бачыш, той вунь, / смелы, / З сінімі вачамі, / Родам з Русі Белай, / Якаў. / Палачанін. / У баях, / на ловах, / Як мядведзь, / ён дужы, / На пірах князёвых / Не гаворыць дужа” [2, с. 66] (“Якаў Палачанін”). У гэтых творах мастацкая дэталь выступае імпульсам для развіцця паэтычнай думкі, будзіць уяўленне. Так, у вобліку летапісца аўтар вылучае ягоныя вочы, у якіх увабраны “боль стагоддзяў” (“Вочы летапісца”); за скупым, лапідарным запісам у летапісе “мужествовав крепко” яму бачыцца бясстрашны воін у крывавай баталіі (“Якаў Палачанін”).

Мужнасць барацьбітоў за родную зямлю натхніла А. Пісьмянкова на напісанне верша “Дума Вітаўта”, прысвечанага Грунвальдскай бітве. “Чорны крыж / на белым полі… / Не распяць нас на крыжы! / Смерць ці воля, / смерць ці воля – / Вырашаюць палашы. / Вырашае меч булатны / І татарская страла. / Вырашае просты ратнік – / Сейбіт з ціхага сяла. / І нястрымная Пагоня, / Што ўразаецца ў крыжы… / Не затопча нашы гоні / Бот чужы!” [2, с. 64] (“Дума Вітаўта”). Моц беларускага народа, яднанне сейбіта і ратніка ў змаганні за свабоду бацькаўшчыны, агульнае імкненне быць вольнымі дапамагаюць перамагчы захопнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мастацкая рэканструкцыя характару беларуса, які жыў шмат стагоддзяў таму, у лірыцы А. Пісьмянкова мае сваю спецыфіку. Аўтар нібы ўступае ў завочную палеміку з літаратурнымі папярэднікамі, прадстаўнікамі рэалістычнага кірунку, не прымаючы растыражаваны вобраз прыгнечанага, забітага мужыка-беларуса. А. Пісьмянкову, відавочна, больш блізкі рамантычны, караткевічаўскі погляд на нацыянальны характар: у яго беларус – велічная, высакародная, гераічная, бясстрашная, адукаваная, вартая павагі і захаплення асоба. Падобная рэпрэзентацыя не супярэчыць гістарычнай праўдзе, садзейнічае абуджэнню нацыянальнага гонару, а таму не можа не імпанаваць.

Такім чынам, увасабляючы тэму гістарычнага мінулага, А. Пісьмянкоў ідзе ад прыватнага да агульнага: ад мінулага ўласнага роду і сваёй сям'і – да мінулага краіны і народа. Аўтар не рэканструюе даўніх падзеі, а канцэнтруе ўвагу на мастацкай дэталі, пры дапамозе якой стварае характар старажытнага беларуса – моцнага целам і духам, ваяўнічага і гераічнага, волата і мудраца. Падобным падыходам ён набліжаецца да Максіма Танка, які таксама "персаніфікаваў" гісторыю ў асобах – выключных прадстаўніках пэўнай эпохі.

Літаратура

1. Марціновіч, А. Белы бусел над Бесяддзю / А. Марціновіч // Полымя. – 2004. – № 10. – С. 180–190.

2. Пісьмянкоў, А. Я не памру пакуль люблю : выбранае / А. Пісьмянкоў. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 319 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ